**ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ**
**па правядзенні выбараў**
**у Каардынацыйную Раду III склікання**

# РАШЭННЕ

**аб адмове ў рэгістрацыі спіса кандыдатаў выбарчага суб'екта**
**для ўдзелу ў выбарах у Каардынацыйную раду**

**25 красавіка 2024 года** **г. Варшава**
**№ 24/04/25-1**

Выбарчая камісія па правядзенні выбараў у Каардынацыйную раду III склікання (далей - Выбарчая камісія) ў асобах Алены Прыходзька (старшыні), Андрэя Атаманчука, Яраслава Бекіша, Дзмітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай і Алены Філатавай, разглядзіўшы звесткі, пададзеныя 22 і 24 красавіка 2024 года заяўніцай Яраславай Грыгор'евым у мэтах рэгістрацыі выбарчага суб'екта "За годнасць беларусак", прыйшла да высновы аб неадпавяданні апошняга патрабаванням пункта 3 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду ад 31 сакавіка 2024 года (далей - Палажэнне), а менавіта:

22 красавіка 2024 года на адрас Выбарчай камісіі паступіла заява ад Яраслава Грыгор'ева, які пазначыў сябе ў спісе выбарчага суб'екта пад іменем "Яраслава Грыгор'еў" і сцвярджаў, што з'яўляецца жанчынай. Пры гэтым Грыгор'еў адзначыў у палітычнай праграме, што выбарчы спіс у поўным складзе з'яўляецца прадстанікамі грамадскай арганізацыі РУХ. У парушэнне палажэння не было далучана рашэнне (або выпіска з рашэння) арганізацыі, якая сфармавала выбарчы суб'ект (то бок арганізацыі РУХ). Акрамя таго, ідэнтыфікацыйны нумар дакумента ўказваў на тое, што Грыгор'еў нарадзіўся мужчынам, а наяўнасць грамадзянства Беларусі не мела ніякага пацвярджэння.

Абставіны таго, што заяўнік не можа пацвердзіць наяўнасць беларускага грамадзянства патлумачыў сам Я. Грыгор'еў у лісце да Выбарчай камісіі ад 23 красавіка 2024 года. Пазней, 24 красавіка 2024 года заяўнік даслаў выпіску з рашэння арганізацыі РУХ, а таксама прасіў унесці змяненні ў спіс, замяніўшы сваю асобу на іншую.

Выбарчая камісія рэгіструе ўсе выбарчыя суб'екты, якія адпавядаюць патрабаванням, пералічаным у пункце 3.2 Палажэння. У прыватнасці, у пп. 3.2.3 пункта 3 замацавана

патрабаванне падаць спіс з не менш як 10 кандытатаў у Каардынацыйную раду. Патрабаванні да кандыдатаў у КР выкладзены ў пункце 5 Палажэння.

Як вынікае з ліста Я. Грыгор’ева ад 23 красавіка 2024 года, ён не пацвердзіў, што з’яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, і, адпаведна, ўключэнне яго ў спіс выбарчага суб’екта не адпавядала патрабаванням Палажэння.

Пададзеная ім 22 красавіка 2024 года заяўка ўтрымлівала 10 асобаў, улічваючы самога Я. Грыгор’ева. Паколькі заяўнік не можа прымаць удзел у выбарах, то пададзены ім спіс выбарчага суб’екта не адпавядае патрабаваням пп. 3.2.3 Палажэння. Унясенне змяненняў у спіс пасля 22 красавіка 2024 года немагчыма, паколькі супярэчыць Палажэнню.

Такім чынам, на падставе пп. 3.2.3 пункта 3, пп. 4.9 пункта 4, пп 6.4 пункта 6 **ВЫРАШАНА:**

У рэгістрацыі выбарчага суб’екта “За годнасць беларусак” для ўдзелу ў выбарах у Каардынацыйную раду - адмовіць.

Старшыня Выбарчай камісіі А. Прыходзька